крыху пра тое, як спявае замерзлая вада», – распавядала мастачка.

✓**10 студзеня** ў Тэатры юнага гледача ў Мінску прайшоў **творчы літаратурны вечар Уладзіміра Ліпскага «Дзялюся крыламі»** з нагоды яго саракавога юбілею на пасадзе галоўнага рэдактара часопіса «Вясёлка». У сувязі з гэтым пісьменнік быў узнагароджаны ганаровым знакам Беларускага фонду культуры «Рупліўцу. Стваральніку».

У. Ліпскі – пісьменнік, грамадскі дзеяч, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, лаўрэат міжнароднай прэміі імя Альберта Швейцара і расійскай прэміі імя Аляксандра Грына. Ініцыятар і старшыня журы фестывалю народнага гумару ў Аўцюках. У творчым скарбе пісьменніка амаль семдзясят кніг для дзяцей і дарослых. Яго творы перакладзеныя на рускую, украінскую, літоўскую, нямецкую мовы.

✓**10 студзеня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася **прэзентацыя электроннага выдання «Станаўленне беларускай дзяржаўнасці: па старонках беларускіх газет 1917 – 1922 гг.»**. Беларускія газеты, заснаваныя ў складаны час узрушэнняў, пераменаў і пабудовы новага дзяржаўнага ладу, сталі сапраўдным летапісам жыцця беларускага народа, каштоўнымі першакрыніцамі і неперадузятымі сведкамі свайго часу.

На двух DVD змешчаныя электронныя копіі прыкладна 2400 нумароў газет, якія выходзілі ў 1917 – 1922 гг. на тэрыторыі сучаснай Беларусі і за яе межамі (у Вільні, Маскве, Оршы, Смаленску ды інш.), але мелі дачыненне да Беларусі. На дысках прадстаўленыя газеты з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і іншых арганізацыяў.

✓**15 студзеня** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адкрылася **выстаўка мастацкіх фатаграфіяў «Кітай учора і сёння. Гістарычная і сучасная кітайская архітэктура» Армэна Сардарава** – дэкана архітэктурнага факультэта Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, доктара архітэктуры, прафесара. Выстаўка прысвечаная 70-годдзю ўтварэння Кітайскай Народнай Рэспублікі.

А. Сардараў – архітэктар-вучоны, фотамастак, аўтар шматлікіх кніг і артыкулаў, архітэктурных твораў, сярод якіх – «Пачатак шляхоў Беларусі» ў Мінску, скульптурная кампазіцыя «Маці-Пастаўшчына» ў Паставах, скульптурная кампазіцыя «Божая маці» ў Маладзечне.